7. Пролог (1919–1920 гг.). [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://time.bsu.by/ru/bsu-hist/bsu-history/1921-1941/prolog-1919-1920.html. Дата доступа: 17.09.2017.

8. Ректоры университета. Кроль Михаил Борисович. [Электронный ресурс]. Режим доступа: https://www.bsmu.by/page/6/1584. Дата доступа: 6.09.2017.

9. *Улащик, В. С.* Михаил Борисович Кроль (1879–1939) – белорусский учёный, организатор медицинского образования и медицинской печати // Здравоохранение. 2014. № 1. С. 69–70.

**Лізуноў Андрэй Іванавіч**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

## ЭТАПЫ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТУ

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт з’яўляецца вядучай установай вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, флагмана вышэйшай адукацыі Беларусі. З’яўляючыся старэйшай дзеючай установай вышэйшай адукацыі БДУ мае багатую гісторыю, традыцыі і цэлы шэраг славутых выпускнікоў, якія ўнеслі свой унесак у гісторыю Беларускай Дзяржавы. Таму важна ведаць гісторыю Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, ведаць кожны яе этап, дзеля разумення агульнага развіцця БДУ.

Першым этапам гісторыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – гэта этап стварэння і першапачатковай дзейнасці. БДУ быў адчынены 30 кастрычніка 1921 г., а заснаваны 11 ліпеня 1921 г. А першыя крокі ў гэтым напрамку былі прадпрыняты 25 лютага 1919 г. Але і да гэтага існавала ідэя стварэння ў Мінску ўніверсітэту. На пачатак XX ст. існавала некалькі планаў аб адчыненні на Беларусі ўстановы вушэйшай адукацыі. Віцебская і Мінскія гарадскіе думы ў 1903 г. выношвалі планы адчынення ў Віцебску альбо Мінску ўніверсітэту. На паседжанні Мінскай гарадской думы ад 3-га верасня 1903 г. гэтую ідэю выказаў сябра думы В. О. Янчэўскі. Мінская Дума падхапіла гэтую прапазіцыю і звярнулся да ўраду, але гэтая ідэя заасталася без падтрымкі [4, с. 30].

Наступная спроба адчыніць універсітэт адбылася 1916 г. Да Міністэрства народнай асветы Расійскай Імперыі звярнуліся наступныя ўстановы: Магілёўскае губернскае земскае сабранне, Віцебская губернская земская управа, Мінская гарадская Дума, Мінскае губернскае земства. Іх прапанова мела наступны сэнс: адчыніць у якім-небудзь горадзе на неакупаванай частцы Беларусі ўніверсітэт. Але Міністэрства народнай асветы адказала адмовай, тлумачучы сваю пазіцыю тым, што адзіным горадам, які можа браць на сябе ролю навуковага цэнтру з’яўляецца Мінск, але Мінск горад прыфрантавы [4, с. 33].

Наступны раз ідэя аб стварэнні ўніверсітэту прагучала пасля Лютаўскай рэвалюцыі. Пытанне аб адчыненні ўніверсітэту ўвайшло ў праграмныя запатрабаванні беларускіх нацыянальных арганізацый. Першыя крокі да стварэння ўніверсітэту зрабіў Народны Сакратарыят Беларускай Народнай Рэспублікі. Праектам разпрацоўкі ўніверсітэтут займаліся Яўхім Карскі і Мітрафан Доўнар-Запольскі. Але спробы Народнага Сакратарыяту БНР апынуліся по бальшай частцы без выніковымі [3, с. 79].

ЦВК ССРБ лічыў, што заснаванне Беларускага ўніверсітэта з'яўляецца адным з неабходных да вырашэння пытанняў. Першыя крокі да адчынення Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта былі ажыцяўлены Прэзідыўмам ЦВК ССРБ 24–25 лютага 1919 г. Былі асігнаваны грошы на арганізацыйную працу, вызначана месца дзе будзе дзейнічаць універсітэт (маёнтак у Лошыцы). Але гэта справа была спынена на пэўны час з-за савецка-польскай вайны і часовай акупацыі Мінску з боку Польшчы. Праца ўніверсітэтскай камісіі аднаваілася толькі пасля вызвалення Мінска ў 1920 г. [4, с. 40].

11 ліпеня 1921 г. было зацверджанна праўленне ўніверсітэту Народным камісарыятам асветы БССР у складзе: рэктар У. І Пічэта , У. М. Ігнатоўскі, Ф. Ф. Турук , М. Я. Фрумкіна. У гэты ж дзень адбылося ўрачыстае паседжанне ў Мінскім гарадскім тэатры, на якім быў абнародаваны тэкст Дэкрэту аб адчыненні Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту. Таксама Ігнатоўскім, была агучана пастанова Калегіі Наркомасветы аб прызначэнні рэктарам У. І. Пічэты і склад праўлення ўніверсітэта [4, с. 48].

На дадзеным этапе гісторыі БДУ была невялікая колькасць факультэтаў: рабочы, медыцынскі і грамадскіх навук. За перыяд 1921–1925 гадоў быў адчынены педагагічны факультэт у 1922 г. Кадравае пытанне вырашалася наступным чынам: у БДУ прысылаліся выкладчыкі з Маскоўскага, Казанскага і Пецербуржскага ўніверсітэтаў. Кіраванне ажыцяўлялася Праўленнем БДУ на чале з рэктарам, дэканы факультэтаў, Савет універсітэту, Саветы факультэтаў і прадметныя камісіі. У 1922 г., згодна новаму Статуту БДУ, было перавыбрана праўленне. Яго склад па большасці захаваўся.

Такім чынам, можна сказаць, што першы этап развіцця БДУ ахапіў сабой 1921–1925 гады. На гэтым этапе быў створан Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт: яго структура, сістэма кіравання, сфармавана кадравая структура ўніверсітэта. Дадзены этап з'яўляеца адным з самых складаных этапаў у развіцці БДУ, бо ва ўмовах пасляваеннай разрухі стварць новую ўстанову вышэйшай адукацыі з'яўлялася вельмі цяжкай і маруднай справай, але дзякуючы цітанічнай працы БДУ быў створан.

Другі этап у развіцці БДУ гэта 1925–1941 гады. Па-першае адбылася змена структуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1925 г. быў зачынены факультэт грамадскіх навук. Замест яго быў створаны факультэт права і гаспадаркі. Гэты факультэт праіснаваў да 1929 г. У гэты годзе ён быў падзелены на два факультэты: факультэт народнай гаспадаркі і факультэт права і савецкага будаўніцтва. У 1929 г. таксама быў створаны новы факультэт – хіміка-

тэхналагічны. У гэтым годзе адбылася змена рэктара БДУ. Замест Пічэты быў пастаўлены Я. П. Каранеўскі [1, с. 182].

У 1926 г. Народны камісарыят асветы ініцыянаваў новы Статут БДУ. Прыняты ён быў 30 студзеня 1929 г. Згодна новаму Статуту БДУ кіраванне Ўніверсітэтам пачало складвацца на прынцыпе адзінаначалля. Такім чынам змянілася структура кіравання: сябры Праўлення БДУ прызначаліся на свае пасады, расфармаваны саветы факультэтаў і аддзяленняў, прадметныя камісіі. Рэктар і дэканы пачалі несці асабістую адказнасць.

У 1930/1931 годзе адбылося так званае "разукрупненне БДУ". Згодна з гэтым планам шэраг факультэтаў прапанавалася вывесці са складу БДУ і стварыць на іх базе самастойныя установы вышэйшай адукацыі. Такім чынам былі створаны Мінскі медыцынскі інстытут, Інстытут народнай гаспадаркі, Палітэхнічны інстытут, Вышэйшы педагагічны інстытут, Інстытут савецкага будаўніцтва і права [2, с. 28–29].

Разукрупненне Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта апнулася ледзь не знішчэннем універсітэту. У складзе БДУ засталося 3 факультэты: фізіка-матэматычны, хімічны, біялагічны. Паступова БДУ пачаў адраджацца і зноў прымаць выгляд класічнага ўніверсітэту. У 1934 г. ў БДУ былі адчынены гістарычны і геаграфічны факультэты. У 1939 г. быў зачынены рабфак і адчынены філалагічны факультэт, які складаўся з дзвух аддзяленняў. Напярэдадні Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай Вайны ў Беларускім дзяржаўным універсітэце працавала шэсць факультэтаў [5, с. 6].

Такім чынам на дадзенным этапе развіцця Ўніверсітэту можна зрабіць наступныя вынікі. Была зменена структура кіравання ўніверсітэтам, была ўведзена сістэма асабістай адказнасці. Ліквідаваны ўсе органы калегіяльнага кіравання. З структуры БДУ былі вылучаны ў самастойныя навучальныя ўстановы і створаны новыя факультэты ў складзе Беларускага дзяржаўнага ўнівірсітэту.

Наступны этап гісторыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту гэта перыяд Вялікай Айчыннай Вайны 1941–1945 гады. З пачаткам вайны на фронт накіраваліся 450 выкладчыкаў і студэнтаў БДУ. Адбылася спроба эвакуяваць Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Эвакуявацца удалося толькі 620 навукоўцам БДУ. Да 1943 г. большая іх частка была раскідана па ўсяму Савецкаму Саюзу. У чэрвені 1942 г. партыйнае кіраўніцтва БССР узняло пытанні аб аднаўленні працы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. 15 траўня 1943 г. СНК СССР прынало пастанову "Аб аднаўленн працы Беларускага Дзяржаўнага Ўніверсітэта". Новым месцам дыслакацыі БДУ была абрана чыгуначная станцыя Сходня. Была аднаўлена дзейнасць шасці факультэтаў: гістарычнага, філалагічнага, біялагічнага, геаграфічнага, фізіка-матэматычнага, хімічнага. Заняткі пачаліся са спазненнем 11 кастрычніка 1943 г. [2, с. 113]. Пасля вызвалення тэрыторыі БССР ад нямецкіх захопнікаў у ліпені 1944 г. пачаліся настроі на вяртанне Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту ў Мінск. І нарэшце на прыканцы ліпеня і ў пачатку жніўня 1944 г. ў Мінск паехалі дзве групы студэнтаў БДУ. Гэтыя групы пачалі аднаўленне БДУ. Навучальны год

1944/1945 пачаўся са спазненнем 15–22 кастрычніка 1944 г. За гэты перыяд увесь педагагічны і студэнцкі склад БДУ вярнуліся ў Мінск.

Такім чынам, этап 1941–1945 гг. з'яўляецца самым цяжкім у гісторыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту. Вынішчэнне маёмасці БДУ, цяжкі час аднаўлення выкліканы нямецкай акупацыяй. Дзякуючы рашэнням СНК БССР і стараннай працы выкладчыкаў БДУ універсітэт удалося захаваць.

Наступным этапам развіцця БДУ былі часы пасляваеннага аднаўлення, якія ахапілі 1945–1953 гг. Гэта былі адны з найцяжэйшых гадоў, як для Ўніверсітэта, так і для Беларусі ў цэлым. У 1946 г. ў складзе БДУ было сем факультэтаў. У 1944 г. быў створаны факультэт журналістыкі, але ўжо ў 1947 г. быў уведзены ў склад філалагічнага факультэта. На гістарычным і філалагічным факультэтах адычняліся новыя аддзяленні, якія пераўтвараліся пазней ў самастойныя факультэты. Напрыклад, філасоўскае аддзяленне гістфака [2, с. 120].

У 1946 г. пачаўся перавод БДУ на мірныя рэйкі. Аднавіўся пяцігадовы тэрмін навучання, з'явіўся конкурс пры паступленні. Захоўваліся праблемы з матэрыяльным забяспячэннем. Гэтая з'ява тармазіла працэс эфектыўнасці навучання. У 1946 г. БДУ быў выведзены са складу Наркамату асветы БССР і пераведзена ў склад створанага Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР. Гэта кепска адлюстравалася на працы БДУ, з'явіліся праблемы з фінансаваннем, цяжкасці з вырашэннем цякучых праблем [2, с. 134].

Наступным этапам развіцця Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту з'яўляецца перыяд 1953–1989 гг. За гэты перыяд БДУ былі ажыццяўляны шэраг інавацый у навучальным працэсе. Пастановай Савета Міністраў СССР ад 22 верасня 1968 г. былі указаны функцыі ўніверсітэту: падрыхтоўка высакакваліфікаваных кадраў, выхаваўчая праца. БДУ знаходзіўся пад пільным кантролем партыйных і дзяржыўных органаў. За гэты час быў створан шэраг новых факультэтаў у складзе БДУ: юрыдычны факультэт, вячэрні факультэт (потым аддзяленне), факультэт грамадскіх прафесій, факультэт павышэння кваліфікацыі, факультэт журналістыкі. У 1970-х гг. былі адчынены факультэт прыкладной матэматыкі, фізічны і матэматычны. На прыканцы 1970-х гг. адбылося драбленне фізічнага факультэта на фізіку і радыёфізіку і электроніку.

Апошній этап гісторыі Ўніверсітэта гэта сучасны этап. Свой пачатак ён бярэ з абрацення незалежнасці Рэспублікі Беларусь у 1991 г. і працягваецца да нашых дзён. У гэты час быў адчынен шэраг факультэтаў, неабходных для незалежнай Беларусі. Першым у гэтым спісе стаў факультэт міжнародных адносін. Апошні з новаўтвораных гэта факультэт даўніверсітэцкай адукацыі.

Такім чынам у гісторыі развіцця Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта можна вылучыць наступныя этапы:

1. 1921–1925 гады – этап фарміравання і першапачатковага функцыянавання БДУ;

2. 1925–1941 гады – этап даваеннага развіцця Ўніверсітэту, для якога характэрна змена ўнутранай структуры і структуры кіравання;

3. 1941–1945 гады – этап дзейнасці БДУ ў эвакуацыі, вяртанне БДУ у Мінск у 1944 г.;

4. 1945–1953 гады – этап пасляваеннага аднаўлення Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту;

5. 1953–1991 гады – этап развіцця БДУ, для якога характэрна развіццё і пашырэнне ўнутранай структуры, яе пашырэнне ў колькасным плане.

6. 1991 г. і па нашыя дні. На гэтым этапе Ўніверсітэт з'яўляецца флагманам беларускай сістэмы вышэйшай адукацыі, нацыянальным навуковым цэнтрам, які адыгрывае значную ролю ў дзяржаўным будаўніцтве Рэспублікі Беларусь.

## Бібліяграфічны спіс


1. *Баранова, Е. В.* В. И. Пичета и власть в 1920 гг. // Российско-славянские исследования: науч. сб. 2009. Вып. 4. С. 178–186.

2. Белорусский ордена Трудового Красного Знамени государственный университет им. В. И. Ленина / Редкол.: А. Н. Севченко [и др.]. Минск: Изд-во БГУ, 1971. 319 с.

3. *Кіпель, Я.* Эпізоды / Пад рэд. І. Урбановіч, З. Саўкі. Нью-Йорк, 1998. 305 с.

4. *Пічэта, У. І.* Пытанне аб вышэйшай школе на Беларусі ў мінулым. Мінск: Навука і тэхніка, 1991. 48 с.

5. *Яноўскі, А. А.* У пошуках аптымальных методык выкладання (з гісторыі арганізацыі вучэбнага працэсу ў БДУ ў 1920–1930-я гады) // Гісторыя: праблемы выкладання. 2006. № 6. С. 3–10.



**Літвіноўская Юлія Іваноўна**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*(Мінск, Беларусь)*


# СТАН БЕЛАРУСКАЙ АСВЕТЫ НА ПАЧАТКУ XIX ст.

На канец XVIII – першую палову XIX ст. прыпадае пачатковы этап новых, пасля раздзелаў Рэчы Паспалітай, узаемаадносін паміж культурамі Беларусі і Расіі. На пярэднім плане гэтых даволі складаных і неадназначных узаемаадносін апынуліся такія ўжо сфарміраваныя культурныя плыні, як шляхецкая культура Беларусі і руская дваранская імперская культура. Шмат у чым гэтыя культуры былі роўнавялікія, найперш на ўзроўню развіцця. Да XIX ст. яны прыйшлі значна адноўленымі бурнымі працэсамі еўрапеізацыі, узбагачаныя ідэямі і ідэаламі эпохі Асветніцтва, аднак мелі розныкультурны вопыт, арыентацыі і традыцыі. І гэта, апошняя, пазначалася на развіцці ўсіх сфер культурнага жыцця краю, асабліва народнай асветы.